# Больш увагі, сіл, энтузіазму на соцыялістычную перабудову вёскі

(Артыкул генэральнага сэкратара ЦК КП(б)Б тав. ГАМАРНІКА)

Напруджаным тэмпам індустрыялізацыя нашае краіны, соцыялістычная рэконструкцыя сельскае гаспадаркі, магутным тэмпам разгортваньне савгаснага і колгаснага будаўніцтва—гэтая генэральная лінія нашае партыі знаходзіць самы гарачы, поўны энтузіязму, патосу соцыялістычнага будаўніцтва, водгук у самых шырокіх пластох, у самай гушчы рабочых і працоўных мас вёскі. Толькі ў атмосфэры поўнага падтрыманьня лініі партыі з боку рабочае клясы магла нарадзіцца і нарадзілася прапанова ленінградзкага пролетарыя аб дню індустрыялізацыі і была падхоплена ўсёй рабочай клясай Саюзу. З сёньнешняга дню 6-е жніўня—вялікі гістарычны дзень, важнейшая веха ў будаўніцтве соцыялізму. Толькі ў абставінах поўнага падтрыманьня лініі партыі з боку батрацкіх, бядняцкіх і серадняцкіх мас, усё мацнеючага кіраўніцтва вёскай з боку рабочае клясы, у абставінах пасьпяховага і рашучага наступу на кулака ў вёсцы магла нарадзіцца і нарадзілася прапанова, падхопленая мільёнамі аб правядзеньні дню колектывізацыі. Дзень індустрыялізацыі і дзень колектывізацыі—вось на сучасным этапе, сапраўдная змычка гораду і вёскі, змычка, якой ня хочуць і ня могуць зразумець правыя ўхілістыя.

З сёнешняга дню 28 жніўня ў календары Савецкай Беларусі будзе азначана днём колектывізацыі. Першы „дзень колектывізацыі“ ў Беларусі мы праводзім у абставінах першага году, большым тэмпам, разгортваемай масавай колектывізацыі. У бягучым годзе пад колгасамі мы падвойваем плошчу, у наяўнасьці агульнае ўзбуйненьне колгасаў, створаны колгасы па тысячы, дзьве, тры і чатыры тысячы гэктараў. Трэба проста сказаць, што разьлікі ўсіх нашых органаў аказаліся зьменшанымі, проста хвасьціцкімі, недаўлічылі таго размаху колектывізацыі, які гэтай справе далі бядняцка-серадняцкія масы вёскі. Гэта дае нам усе падставы на будучы год проэктаваць значна больш высокі, больш напруджаны тэмп колектывізацыі. Гэта патрабуе ад нас і перагляду тэмпу колектывізацыі, запроэктаванага пяцігодкай у 16 проц. у бок павялічэньня. Ёсьць усе падставы

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы